Источник: "Беларусь" - №3, 2012-03-20






# Бывай, зброя!

У ЦЭНТРЫ ЎТЫЛІЗАЦЫІ АВІЯЦЫЙНЫХ СРОДКАЎ ПАРАЖЭННЯ, ЯКІ ПАДПАРАДКОЎВАЕЦЦА ДЗЯРЖАЎНАМУ НАВУКОВА-ВЫТВОРЧАМУ АБ'ЯДНАННЮ ПАРАШКОВАЙ МЕТАЛУРГІІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ, НЕ ТОЛЬКІ АБЯСШКОДЖВАЮЦЬ САСТАРЭЛЫЯ БОЕПРЫПАСЫ, АЛЕ І ВЫРАБЛЯЮЦЬ ІНАВАЦЫЙНУЮ ПРАДУКЦЫЮ

Як вядома, каб быць мабільнай і баяздольнай і пры выпадку абараніць інтарэсы сваёй краіны, а таксама адбіць напад ворага, любая армія павінна мадэрнізавацца. Ваенным неабходна валодаць сучаснымі тэхналогіямі, новай тэхнікай, зброяй, боепрыпасамі. Але куды дзяваць старыя патроны, снарады? З аднаго боку, яны ўжо не могуць выконваць сваю функцыю. З іншага, становяцца небяспечнымі пры захоўванні. Складанае пытанне. У розных краінах яно вырашаецца па-рознаму. У Расіі, напрыклад, устарэлыя боепрыпасы ў асноўным адвозяць на бязлюдны палігон і ўзрываюць. Але ўтылізаваць бомбы і міны — не заўсёды значыць знішчыць. Ёсць тэхналогіі, якія дазваляюць дастаць з іх узрыўчатку. А корпус адправіць на металалом. Каб выняць зарад, існуе некалькі спосабаў: выплаўленне, вымыванне, механічнае выбіванне, магнітадынамічнае ўздзеянне альбо ўздзеянне звышнізкіх тэмператур і іншыя. Напрыклад, вымыванне струменем вады прымяняецца ў сучаснай амерыканскай арміі. У Беларусі ж пайшлі іншым шляхам. Унікальная тэхналогія, якая прымяняецца на прадпрыемстве, размешчаным у Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці, дае магчымасць бяспечна выняць зарад з бомбаў і мін, а таксама выкарыстаць яго пасля для вытворчасці звышмагутнай прамысловай узрыўчаткі.

## ГРАМАТНА І АСЦЯРОЖНА

Прадпрыемства, пра якое ідзе размова, называецца Цэнтр утылізацыі авіяцыйных сродкаў паражэння. Яно размешчана на тэрыторыі дзеючай ваеннай часці, але падпарадкоўваецца мірнай установе — Дзяржаўнаму навукова-вытворчаму аб'яднанню парашковай металургіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Хоць меры засцярогі там — на самым высокім узроўні: глыбокі роў з вадой па перыметры, вароты з некалькімі радамі калючага дроту, ахоўнік з аўтаматам, відэакамеры... Тэхналогія і абсталяванне для гэтага завода распрацаваныя ў Падмаскоўі, у Чырвонаармейскім навукова-даследчым інстытуце механізацыі — адным з вядучых прадпрыемстваў расійскай

"абаронкі". Там жа навучалі персанал, распрацоўвалі меры бяспекі на выпадак пазаштатнай сітуацыі. Калі не дай бог адбудзецца выбух, персанал укрыецца за бетоннымі сценамі таўшчынёй больш за метр. Земляны вал аддзяляе адміністрацыйны корпус ад асноўнага цэха. А сістэма тушэння пажару здольная запоўніць памяшканне вадой ледзь не на паўметра за лічаныя секунды.

## ЧЫСТАЯ ЭКАЛОГІЯ І ЭКАНАМІЧНАЯ ВЫГАДА

Боепрыпасы, якія ўтылізуюць на заводзе, праляжалі на складах па 30—40 гадоў. Іх прывозяць туды з усёй Беларусі. Ад старасці трэскаюцца драўляныя скрыні, у якія "ўпакаваныя" бомбы. Але самая вялікая праблема, на думку дырэктара завода Валерыя Дзербана, воку незаўважная:

— Праз хімічныя працэсы, што працякаюць унутры, боепрыпасы становяцца небяспечнымі ў абыходжанні. Каб пазбавіцца ад крыніцы тэхнагеннай небяспекі, іх утылізуюць. Калі б мы іх проста ўзрывалі — забруджвалі б навакольнае асяроддзе. Ды і з эканамічнага пункту гледжання гэта нявыгадна. А дзякуючы тэхналогіі захавання "начынкі" ўстарэлых бомб і фугасных мін мы выпускаем прамысловую ўзрыўчатку.

## ГРЫМУЧАЯ СУМЕСЬ

Працэс утылізацыі пачынаецца з таго, што корпус боепрыпасу, напрыклад, бомбы, разнімаюць на часткі, дастаюць узрывальнік. Аперацыі гэтыя асабліва небяспечныя. Таму іх выконвае робат. Пасля рабочыя ўкладваюць небяспечны груз на каляску і вязуць у асноўны цэх: на ўстаноўку вымывання. З фугаснымі мінамі — тая ж гісторыя. Калі я пабываў у цэху, менавіта такая міна была ўстаноўлена на лажаменце. Іван Касцюкевіч, майстар, які працуе тут ужо 10 гадоў, расказаў, што будзе з ёй адбывацца:

— У тыльную частку міны пад ціскам у 4 атмасферы будзе падавацца струмень расплаўленага парафіну. Менавіта ён і вымывае зарад.

Затым уся сумесь трапляе ў раздзяляльнік: больш цяжкае выбуховае рэчыва асядае, а парафін вяртаецца назад ў помпавую ўстаноўку... Усё гатова да запуску помпы. Людзі пакідаюць цэх і ідуць у паўпадземнае памяшканне, адкуль пры дапамозе відэакамер і спецыяльных датчыкаў сочаць за працэсам. Калі небяспечныя аперацыі завершаныя, мы вяртаемся ў цэх. Там я даведваюся, што не ўсе зарады аднолькавыя:

— Выплаўлены траціл, напрыклад, у вадкім стане разліваюць па формах, — расказвае Касцюкевіч. — Калі ён застывае, яго ўпакоўваюць. Але калі ў боепрыпасе сумесь розных выбуховых рэчываў, працаваць з ім больш складана і небяспечна.

Як, напрыклад, у тых, што цяпер утылізуюць на заводзе. Фугас, які мне паказалі, быў напоўнены алюмініевай пудрай, гексагенам і трацілам. Гэта вельмі выбухованебяспечнае рэчыва. Каб зменшыць яго адчувальнасць да знешніх уздзеянняў, на заводзе ў яго дадаюць яшчэ больш трацілу,які быў выплаўлены раней з іншых боепрыпасаў. Такім чынам, атрымліваюць альгетол — вельмі магутную прамысловую ўзрыўчатку.



## СПАТРЭБІЦЦА Ў КАР'ЕРЫ

Карпусы адпрацаваных бомбаў і мін пойдуць на металалом. Што ж да нашага супермагутнага альгетолу, мяшкі з ім адпраўляюць на склад. Пакуль узрыўчатка афіцыйна не зарэгістравана, выкарыстоўваць яе ў прамысловасці нельга. Аднак яе ўжо выпрабавалі на прадпрыемстве "Даламіт". Гэта адкрытае акцыянернае таварыства, размешчанае за 15 кіламетраў ад Віцебска, займаецца здабычай карыснага выкапня — даламіту.

— Каб атрымаць даламіт, вялізны кавалак горнай пароды трэба адкалоць ад сухога горнага ўступа альбо ад берага возера 30-метровай глыбіні. І здрабніць, — расказвае намеснік начальніка кар'ера па вытворчасці Анатоль Болатаў. — Для гэтага бурым свідравіны. Закладваем у іх узрыўчатку. І падрываем. Паколькі альгетол — узрыўчатка магутная, з меншай плошчы кар'ера ён дае магчымасць атрымаць больш прадукцыі. У канчатковым выніку яна становіцца больш таннай. Памяншаецца расход электраэнергіі, знос тэхнікі.

Акрамя таго, звышмагутная прамысловая ўзрыўчатка беларускай вытворчасці здольная дапамагчы "Даламіту" з'эканоміць вялікія валютныя сродкі. Бо на закупку выбуховых рэчываў у Расіі і ва Украіне прадпрыемства штогод выдаткоўвае амаль мільён долараў! Вызваленую валюту можна будзе пусціць на рамонт і набыццё горназдабыўной тэхнікі. Бо акрамя БелАЗаў і пагрузчыкаў, якія працуюць у кар'еры "Даламіта", уся тэхніка выраблена за мяжой. У асноўным на прасторах былога СССР.

Калі Цэнтр утылізацыі авіяцыйных сродкаў паражэння вырабляе такі эксклюзіўны, неабходны ў горназдабыўной прамысловасці прадукт, ці не збіраецца ён яго пасля праходжання сертыфікацыі экспартаваць за мяжу? Аказваецца, не. Аб'ёмы для гэтага не вельмі вялікія. Уся выробленая на ім прамысловая ўзрыўчатка можа быць выкарыстана ў Беларусі. Атрымліваецца, прадпрыемства, на якім я пабываў, вырашае адразу некалькі важных задач. З аднаго боку, яно ўтылізуе небяспечныя ўстарэлыя боепрыпасы. А з іншага, выпускае інавацыйную імпартазамяшчальную прадукцыю, здольную прынесці карысць усёй беларускай эканоміцы.

Сяргей **Гоманаў**

**■ Адкрытае акцыянернае таварыства "Даламіт" — адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў беларускай горназдабыўной прамысловасці. У год вырабляе 4 мільёны тон даламіту. Даламітавая мука прымяняецца ў сельскай гаспадарцы, даламітавы шчэбень выкарыстоўваюць пры будаўніцтве дарог, а даламітавы мінеральны парашок неабходны пры вытворчасці асфальту. Пятая частка прадукцыі экспартуецца ў Расію, Літву і ва Украіну.**

Сяргей Гоманаў. Бывай, зброя!